■ Па слядах чэмпіянату

ЛЫЖКА МЁДУ І... КАДРАВЫЯ ПЕРАСТАНОЎКІ

Арганізацыя чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску выклікала неймаверную колькасць станоўчых водгукаў і самых гучных эпітэтаў. Але, каб быць зусім аб'ектыўнымі, давайце звернемся да лічбаў і статыстычных даных. «Звязда» з першых вуснаў даведалася пра фінансавую выгаду ад чэмпіянату, пазітыўны ўплыў спартыўнага форуму на гасцінічны бізнес і змены, якія чакаюць беларускі хакей.

ПАДЛІЧЫМ ПЛЮСЫ!

Больш за 80 тыс. гасцей падчас чэмпіянату скарысталіся правам бязвізавага ўезду ў нашу краіну. З іх 30 тыс. — прадстаўнікі дзяржаў, з якімі ў Беларусі візавыя адносіны, і больш за 50 тыс. гасцей — з краін СНД. Усяго матчы турніру наведалі 651 846 гледачоў, што з'яўляецца новым рэкордам чэмпіянатаў свету па хакеі. Па словах прадстаўніка кампаніі TicketPro Антона Кузьміча, запаўняльнасць трыбун на рэйтынгавых гульнях (матчы зборных Расіі, Беларусі, Канады, Чэхіі, Славакіі) склала 100%, на нярэйтынгавых — 80%. Дарэчы, толькі на рэалізацыі білетаў атрымалася выручыць 150 млрд руб., а гэта больш, чым прагназавалася. Па словах кіраўніка Беларускай федэрацыі хакея і дырэктара Дырэкцыі па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2014 Яўгена Ворсіна, ускосныя даходы пакуль не падлічаны, але ёсць усе падставы лічыць, што турнір цалкам акупіцца.

«Здзівіў таваразварот сувенірнай прадукцыі, — кажа Яўген Ворсін. — Нягледзячы на тое, што асартымент быў не досыць шырокі, а цэны — немаленькія. Што датычыцца арганізацыйных момантаў, то нельга не згадаць цырымонію ўзняцця сцягоў краін — удзельніц чэмпіянату. Нам здавалася, што гэта звычайнае афіцыйнае мерапрыемства, аднак яно выклікала шчыры інтарэс многіх людзей. І цяпер гэтае мерапрыемства можа стаць пастаянным на наступных чэмпіянатах свету. Асобна хачу адзначыць якасную працу медперсаналу. І дарэчы, на турніры не было выяўлена ніводнай станоўчай допінг-спробы, што само па сабе — прыемная адметнасць».

КАЛІ ЁСЦЬ ДЗЕ ЖЫЦЬ...

Да чэмпіянату ў Мінску ў чатыры разы павялічылася колькасць месцаў для засялення турыстаў. Да таго ж усе тарыфы былі замарожаны на 1 студзеня 2014 г., дзякуючы чаму ўдалося дасягнуць высокай загрузкі мінскіх атэляў і гасцініц, якая склала 80%. Для параўнання, летась гэты паказчык быў усяго 55%. Фан-вёска падчас чэмпіянату прыняла 17000 гасцей, сярод якіх былі прадстаўнікі экзатычных краін — Ганы, Кітая, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў... Між іншым, як адзначыла намеснік начальніка па турызме кампаніі «Цэнтркурорт» Алена Брок, пастаяльцы фан-вёскі з задавальненнем куплялі экскурсійныя туры, сярод якіх самымі папулярнымі маршрутамі былі Нясвіж і «Лінія Сталіна».

ХЭНЛАН СЫШОЎ. ХТО НА ЯГО МЕСЦА?

«Яшчэ падчас чэмпіянату Глен Хэнлан спрабаваў пачаць размову аб сваіх намерах пакінуць зборную, але я папрасіў адкласці гутарку да завяршэння турніру, — прыгадвае Яўген Ворсін. — Раней я не чуў, што ён плануе сысці з каманды. Мабыць, Глен з кімсьці і абмяркоўваў свае планы ў красавіку, але гэта быў не я».

Кіраўнік Беларускай федэрацыі хакея ўпэўнівае, што канадскі трэнер быў абсалютна задаволены працоўным працэсам і ні ў чым не меў патрэбы. Акрамя, бадай, сям'і побач. Гэта і стала прычынай ад'езду Хэнлана з Беларусі. Бо жонка трэнера — педагог вышэйшай кваліфікацыі — не змагла б рэалізавацца ў Мінску як спецыяліст. Іншая справа — Швейцарыя...

«Мы разумелі, што трымаць Хэнлана сілай — не выйсце. Таму і пагадзіліся на датэрміновае скасаванне кантракта. У гэтай сітуацыі толькі і заставалася паступіць па-людску».

Яўген Ворсін кажа, што ўжо ёсць чатыры кандыдатуры на пасаду галоўнага трэнера зборнай Беларусі па хакеі. Сярод іх і беларускія спецыялісты, і тыя, хто працуе ў Расіі. Кіраўнік федэрацыі паабяцаў, што цягнуць з гэтым рашэннем ніхто не будзе: хто стане новым трэнерам беларускай каманды, стане вядома 11 чэрвеня, калі адбудзецца справаздачна-выбарчая канферэнцыя федэрацыі.

Між іншым, беларускі хакей чакае яшчэ адна змена: Яўген Ворсін прыняў рашэнне не балатавацца на пасаду старшыні ФХРБ. Дзеючы кіраўнік федэрацыі патлумачыў гэта так: «Калі зборная правальвалася на папярэдніх чэмпіянатах, усе вінавацілі федэрацыю і мяне ў прыватнасці. Хаця ўсе гэтыя гады я прапаноўваў рэальныя праграмы па развіцці беларускага хакея. Але мяне ніхто не слухаў, і мы ішлі па іншым шляху. Зразумела, калі ўсе клапоцяцца толькі пра сваю пасаду, нічога не атрымаецца. Шчыра кажучы, я ад гэтага стаміўся».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

ЗНАЕМ О МЕТАЛЛЕ ВСЕ

ОАО «Лепельский ремонтно-механический завод»:

ОПЫТ, МАСТЕРСТВО, НОВАТОРСТВО

Свою историю предприятие ведет с 1932 года, с июня 2012 года входит в состав производственного объединения «Минский тракторный завод». Сегодня это конкурентоспособный, рентабельный и мобильный коллектив, который ежемесячно наращивает объемы производства. Основная специализация завода – изготовление узлов и деталей для тракторов «Беларус». Предприятие выпускает 17 наименований комплектующих для РУП «МТЗ», это составляет 82 процента в общем объеме товарной продукции. Вторым направлением деятельности является производство оборудования для животноводства, птицеводства и кормопроизводства (транспортеры, птичники и др).

НАШИ ВОЗМОЖНОСТИ:

➢ Парк технологического оборудования позволяет обрабатывать детали диаметром до 250 мм и длиной до 700 мм.

➢ Штамповочный участок оборудован прессами от 40 до 400 тонн, с размерами стола 1000х1000 мм.

➢ Листогибы до 100 т и длиной гибки до 3000 мм.

➢ Установка плазменной резки позволяет обрабатывать детали толщиной до 80 мм и длиной листа 4500 мм.

ПРОИЗВОДИМ И РЕАЛИЗУЕМ:

♦ двери металлические квартирные,
♦ заборы, ограждения, решетки оконные,
♦ контейнеры для мусора, урны,
♦ скамейки, калитки,
♦ ворота гаражные: раздвижные, распашные,
♦ мангалы, сушилки для грибов,
♦ печи для бани, баки,
♦ детские спортивные городки, качели, карусели,
♦ тренажеры силовые,
♦ элементы для крыши,
♦ металлоизделия по индивидуальным заказам

ПРИГЛАШАЕМ К СОТРУДНИЧЕСТВУ!

Сотрудничество с ОАО «Лепельский РМЗ» – прекрасная возможность приобретения тракторов, запчастей и комплектующих к ним без процентной надбавки. Специалисты завода всегда готовы оказать своевременную квалифицированную помощь в вопросах продажи и сервисного обслуживания техники. Изготовим любые металлоконструкции, в том числе мелкосерийные и нестандартные. Выполним работы по металлорежущей обработке, сварке, штамповке и плазменной резке. Четкое исполнение договоров, доставка продукции заказчикам в оговоренные сроки – в лице ОАО «Лепельский ремонтно-механический завод» вы будете иметь надежного партнера.

ОАО «ЛЕПЕЛЬСКИЙ РМЗ»

211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Партизанская, 2
Тел./факс: 8 (02132) 4-07-33;
e-mail: leprmz@mail.ru,
www.leprmz.by

УНП 300039495

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ

по продаже автомобиль SKODA OCTAVIA номер рамы TMBCE11U232673791, год выпуска – 2002, тип двигателя – 2,0 л бензин. Адрес: г. Минск, ул. Олешева, 16.

Начальная цена с НДС – 48 800 000 бел. руб. Задаток с НДС – 4 800 000 бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель - РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Гипросвязь», проводимом 11 июня 2014 г.

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.

Аукцион состоится 11.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 09.06.2014 до 12.00 по адресу:** г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.04.2014. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
• www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru